# 14 ліпеня 2022 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «30-годдзе органаў фінансавых расследаванняў Беларусі»

5 жніўня 1992 года пачынаюць свой гістарычны адлік органы фінансавых расследаванняў Рэспублікі Беларусь.
Прайшоўшы сур'ёзны шлях рэфармавання і пераўтварэнняў даўжынёю ў 30 гадоў, яны занялі дастойнае месца ў сістэме забеспячэння нацыянальнай бяспекі дзяржавы і сёння заклiканы абараняць эканамічныя інтарэсы суверэннай і незалежнай Беларусі.
З пакалення ў пакаленне перадаецца важнейшая традыцыя для работнікаў органаў фінансавых расследаванняў – несці службу, будучы адданымі сваёй справе і вернымі абранаму арыенціру «Айчына. Гонар. Прафесіяналізм».

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Дэпартаментам фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

Спецыяльнае памятнае гашэнне будзе праводзіцца 3 жніўня на паштамце Мінска.

**Source URL:**
*https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/14-lipenya-2022-goda-ministerstva-suvyazi-i-infarmatyzacyi-respubliki-belarus-vypuskae-u*